УДК 316.736:316(=161.3)]:821.161.3.09Колас

***Вярбіцкая Вольга***
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Мінск, Беларусь*

# ІНКУЛЬТУРАЦЫЯ АСОБЫ БЕЛАРУСА ЯК ПРАДМЕТ КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫХ ІНЭНЦЫЙ ТВОРЧАСЦІ ЯКУБА КОЛАСА

Творчая спадчына Я.Коласа даследуецца як тэкст культуры, з пазіцыі комплекснага падыходу; вызначаны змястоўная для культуратворчай дзейнасці пісьменніка ідэі, сугучныя канцэпцыі інкультурацыі, дамінантныя кампаненты культур інтэлігенцыі і сялянства.

***Ключевые слова: інкультурацыя, інтэнцыя, культурная трансмісія, кашўтоўнасці***

Як вядома, фарміраванне асобы адбываецца ў працэсе ўзаемадзеяння чалавека і культуры, пры якім, з аднаго боку, культура вызначае асноўныя рысы чалавека, а з другога – чалавек сам уплывае на культуру. Працэс і вынік засваення традыцый, звычаяў і каштоўна-

сцей роднай культуры, вывучэнне і перадача яе ад аднаго пакалення да другога прынята называць інкультурацыяй. Дадзены тэрмін упершыню быў уведзены амерыканскім антраполагам М.Херсковіцам [1] і да сённяшняга часу застаецца дыскусійным у гуманітарных навуках. Так, Р.Бенедыкт і М.Мід пад інкультурацыяй разумелі рэальны працэс навучання ў межах спецыфічнай культуры [2]. Р.Балес, Т.Парсанс [3], Д.Матсумота [4] лічылі інкультурацыяй працэсы і механізмы, з дапамогай якіх людзі пазнаюць сацыяльныя і культурныя нормы. Нягледзячы на некаторыя разыходжанні большасць даследчыкаў прыходзяць да высновы, што ў працэсе інкультурацыі чалавек засвойвае традыцыйныя формы мыслення і дзеянняў, характэрныя для нацыянальнай культуры, да якой ён належыць. Мэта інкультурацыі – навучанне чалавека традыцыям і нормам паводзін у канкрэтнай культуры. Вынікам яе з'яўляецца эмацыянальнае і паводзінскае падабенства чалавека з іншымі членамі дадзенай культуры і яго адрозненне ад прадстаўнікоў іншых культур.

Паслядоўная змена цыклаў развіцця культуры ў межах аднаго народа ці краіны павінна адбывацца такім чынам, каб з пакалення ў пакаленне перадаваліся базісныя элементы культуры і відазмяняліся другасныя. У адваротным выпадку адбываецца разрыў культурнага працэсу. Дзякуючы культурнай трансмісіі кожнае наступнае пакаленне атрымлівае магчымасць пачынаць з таго, на чым спынілася папярэдняе. У сваю чаргу маладое пакаленне дадае новыя веды, каштоўнасці, сэнсы, вобразы да ўжо назапашаных.

З дапамогай культурнай трансмісіі, група можа ўшанаваць свае асаблівасці ў наступных пакаленнях з дапамогай асноўных механізмаў навучэння. Звычайна вылучаюцца тры разнавіднасці трансмісіі:

• вертыкальная трансмісія, падчас якой культурныя каштоўнасці, уменні, вераванні і т.п. перадаюцца ад бацькоў да дзяцей;

• гарызантальная трансмісія, калі ад народзінаў да сталасці дзіцё асвойвае сацыяльны досвед і традыцыі культуры ў камунікаванні з аднагодкамі;

• «непрамая» трансмісія, пры якой індывід навучаецца ў спецыялізаваных інстытутах сацыялізацыі (школах, вну), а таксама на практыцы – у акружаючых яго апроч бацькоў, сталых сваякоў, суседзяў і т.п.

Беларуская класічная літаратура, якая акумулявала ў сабе важнейшыя духоўныя здабыткі беларускага этнасу, адыгрывае важную ролю ў працэсе культурнай трансмісіі. Яна мастацка-вобразнымі сродкамі перадае наступным пакаленням культурны вопыт. У творчай спадчыне Я.Коласа ўтрымліваюцца пэўныя навукова абгрунтаваныя

палажэнні тэорыі навучання і выхавання, сродкаў фарміравання культурных каштоўнасцей, норм, патэрнаў паводзін асобы, адлюстраваны роля і месца разнастайных сацыякультурных інстытутаў у фарміраванні асобы.

Тэрмін "інкультурацыя" ў публіцыстычных і мастацкіх творах пісьменнік не ўжывае. Ён выкарыстоўваў такія паняцці, як "асвета", "адукацыя", "выхаванне", якія сучаснымі культуролагамі разглядаюцца як складовыя часткі працэсу інкультурацыі. Вывучэнне публіцыстычных артыкулаў, тэкстаў мастацкіх твораў, грунтоўных дыдактычных прац "Методыка роднай мовы [5], "Другое чытанне для дзяцей беларусаў" [6] дазваляе нам гаварыць, што Я.Коласам выказана шмат ідэй, якія ўтрымліваюцца ў сучаснай канцэпцыі інкультурацыі асобы. З тэкстаў пісьменніка вынікае, што выключную ролю ў працэсе інкультурацыі ён адводзіў адукацыі. Свае погляды на месца і ролю школы, змест, метады яе дзейнасці Я.Колас акрэсліў у трылогіі "На ростанях", апавяданні "Туды, на Нёман", шэрагу публіцыстычных артыкулаў. Праблемы развіцця школы разглядаюцца ў артыкулах "Слуцкія курсы", "Школа і дзяржаўнае будаўніцтва", "Нашы савецкія дзеці", "Задачы савецкай школы" [7] і інш. Па меркаванні Я.Коласа, школа і іншыя тыпы навучальных устаноў павінны падрыхтаваць маладое пакаленне да жыцця і грамадскай дзейнасці. Мэта адукацыі, лічыў ён, – даць трывалыя веды аб асноўных сферах чалавечай дзейнасці. У артыкуле "Шануйце і любіце сваю родную мову" Я.Колас пісаў: "Авалодваючы асновамі навук, вам трэба пазнаваць свет, законы, па якіх развіваецца грамадскае жыццё…" [5, с. 28].

Месца адукацыі ў працэсе фарміравання асобы пісьменнік паказаў не толькі ў публіцыстычных артыкулах, але і шэрагу сваіх празаічных і паэтычных твораў. Аб неабходнасці адукацыі разважаюць яго літаратурныя героі ў трылогіі "На ростанях". Андрэй Лабановіч у размове з палешуком Сцяпанам тлумачыць яму, для чаго неабходна адукацыя: "…вашы дзеці вучыцца будуць, граматнымі стануць, будуць кнігі, часопісы чытаць, навучацца, як лепей каля зямлі хадзіць, каб карысці з яе болей было, бо ўсё ж паляпшэнне ў жыцці ад навукі ідзе" [8, с. 18]. Для чаго патрэбна адукацыя, тлумачыў сялянам Астап, адзін з персанажаў апавядання "Туды, на Нёман": "А каб быць гэтым гаспадаром, каб умець сваімі рукамі будаваць сабе жыццё, трэба навука" [9, с. 265]. Аб тым, што нельга жыць без ведаў, паэт сцвярджаў у паэмах "Новая зямля", "Сымон-музыка": "Без навукі жыць пагана, / Яе сню, панок, у сне – / Так хачу я знаць навуку, / За яе б аддаў жыццё…" [10, с. 438].

Акрамя школы, да інстытутаў інкультурацыі Я.Колас адносіў сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы. У артыкулах “Культура і навука ў БССР за 30 год”, “Десять лет спустя” [5], “Шануйце і любіце сваю родную мову” ён адзначаў, што “ …не толькі школы мае беларускі народ. У нас ёсць цяпер тэхнікумы, інстытуты, універсітэт, Акадэмія навук, свае тэатры”, якія эфектыўна ўплываюць на працэс станаўлення асобы [5, с. 26]. Па меркаванні Я.Коласа, менавіта ў гэтых навучальных установах завяршаецца фарміраванне індывіда як суб’екта матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, пазнавальных, практычных, камунікатыўных яго якасцей. У артыкуле “Сябрам-студэнтам” пісьменнік заклікаў моладзь “вучыцца, і не толькі ў сценах універсітэта і інстытутаў, але і па-за іх межамі”, “ісці ў нагу з жыццём, не адставаць, апераджаць яго” [5, с. 210]. Усебакова ролю ВНУ ў працэсе інкультурацыі асобы студэнта пісьменнік паказаў у аповесці “На прасторах жыцця”. Яго літаратурнаму герою Сцёпку Баруту інстытут дапамог пазнаць вартасць існуючых рэчаў, пашырыць кругагляд, выпрацаваць характар, назапасіць веды, неабходныя для актыўнага ўдзелу ў жыцці соцыуму.

У коласаўскай творчай спадчыне даецца навукова-тэарэтычнае абгрунтаванне ролі і месца педагога як агента інкультурацыі ў працэсе фарміравання асобы. У публіцыстычных і мастацкіх тэкстах Я.Колас імкнуўся вырашыць праблему настаўніка, паказваў яго ўплыў на падрастаючае пакаленне. У разуменні пісьменніка настаўнік – гэта чалавек “усебаковай і глыбокай адукацыі”, які “абавязан грунтоўна разбірацца ў законах грамадскага жыцця” [5, с. 40]. Ужо ў ранніх сваіх публікацыях ён рашуча асуджаў зняважлівае стаўленне расійскіх улад да настаўніка. Так, у карэспандэнцыі “Аб народным вучыцелю” (1907) Я.Колас з абурэннем пісаў: “Вучыцель ніколі не бачыў і не бачыць дабра. Усё яго жыццё – адна пакута. І хто над ім не мае волі? Колькі ў яго начальства ўсялякага! І кожнае гэта начальства лічыць сваім правам так ці іначай скубянуць вучыцеля, а то і ўкусіць яго. І вучыцеля скубуць і кусаюць. А яго доля – маўчы і цярпі” [5, с. 308].

Становішча настаўніка ў дарэвалюцыйнай Беларусі праўдзіва паказана ў трылогіі “На ростанях”, дзе створана цэлая галерэя вобразаў вясковых настаўнікаў. Сярод іх ёсць сапраўдныя інтэлігенты з чыстым сумленнем, якія вераць у сваю справу, горача любяць сваю працу. Такім з’яўляецца галоўны герой Андрэй Лабановіч, які ўкладваў у настаўніцкую працу “сваю душу і сэрца” [8, с. 53]. Яму хацелася “абудзіць у вучнях і выклікаць да дзеяння крытычны розум, каб да кожнай з’явы і факта яны падыходзілі з пытаннем – як выніклі? у чым іх прычыны?” [8, с. 37]. Сумленнай, адданай рабоце паказаў пісьмен-

нік і настаўніцу Ірыну ў апавяданні “Туды, на Нёман”: “Новай настаўніцы нялёгка ў школе навучанне весці, бо ёй сапраўды хочацца навучыць дзяцей. Яна ўся рабоце аддаецца” [9, с. 256].

Этнакультурная інтэнцыянальнасць творчай спадчыны Я.Коласа сведчыць, што пісьменнік вызначыў крытэрыі, па якіх можна меркаваць аб адпаведнасці той альбо іншай асобы званню настаўніка. У пісьме да настаўніцы А.Харкевіч Я.Колас пісаў: “Але каб быць добрым настаўнікам, патрэбна, па-першае, мець шырокую агульную адукацыю і спецыяльную, педагагічную, каб умець выхоўваць маленькіх людзей, якія стануць дарослымі і будуць будаваць жыццё, патрэбна любіць такіх людзей, любіць працу і прывіваць любоў да працы і сумленных адносін да жыцця і людзей” [11, с. 412–413]. Як бачна, працэсы адукацыі і выхавання Я.Колас разглядаў як адзінства сацыякультурных, педагагічных і псіхалагічных элементаў. Яму было ўласціва яснае разуменне сацыяльнага характару выхавання і яго значэння для грамадства, правільнае вызначэнне ролі школы і настаўніка ў працэсе інкультурацыі асобы.

Актыўнымі агентамі інкультурацыі Я.Колас лічыў дзеячаў культуры і мастацтва. Асабліва шмат увагі ён надаваў дзейнасці паэтаў і пісьменнікаў у галіне выхавання моладзі. Ва “Уступнай прамове на Трэцім з’ездзе савецкіх пісьменнікаў Беларусі”, вызначаючы задачы літаратараў, ён падкрэсліваў, што “ў полі зроку паэта, пісьменніка павінны знаходзіцца і пытанні выхавання маладога пакалення, любасць да працы – фізічнай і ўсякай іншай” [5, с. 252]. У шэрагу публіцыстычных артыкулаў Я.Колас засяроджваў увагу грамадскасці на неабходнасці выкарыстання літаратуры як магутнага сродку ўплыву, умацавання і ўкаранення ідэй у свядомасць мас [7, с. 104]. У артыкуле “Современность и писатель” ён адзначаў, што літаратура “является действенной, воспитывающей народные массы общественной силой” [5, с. 364]. Аб літаратуры як магутным сродку выхавання мас гаворыцца ў артыкулах “Писатель и его работа“, “Аб літаратурнай працы” [5], “Трыумф культурнай рэвалюцыі “ [7] і інш. У якасці важнейшага кірунку дзейнасці літаратараў Я.Колас вылучаў стварэнне высокамастацкіх твораў, якія б “падымалі і захаплялі чалавека” [5, с. 253]. Ён быў перакананы, што ў лепшых творах літаратуры вобразы станоўчых герояў нясуць зерне высокамаральнага чалавека: “Сапраўднае ж слова паэта-грамадзяніна павінна запальваць агонь у сэрцах людзей і клікаць іх наперад, на шлях прагрэсу, культуры і маральнага ўдасканалення” [5, с. 248]. Вылучаючы ролю літаратуры ў мастацкім выхаванні моладзі, пісьменнік быў занепакоены становішчам, звязаным з выкладаннем літаратуры ў школе. У “Прамове на III пле-

нуме праўлення Саюза пісьменнікаў СССР" Я.Колас з горыччу гаварыў аб недахопах мастацкага выхавання школьнікаў і выказаў меркаванні наконт паляпшэння выкладання літаратуры: "Да гэтага часу школа не здолела зацікавіць, захапіць хараством сапраўднай паэзіі сваіх гадаванцаў" [7, с. 198]. Перад літаратарамі ён ставіў задачу стварэння якасных падручнікаў па гісторыі літаратуры, падборы цікавага мастацкага матэрыялу ў кнігі для школьнага чытання.

У артыкуле "Культура і навука ў БССР за 30 год" паказваецца значэнне тэатральнага, музычнага, выяўленчага мастацтва, кіно ў інкультурацыі асобы. Ім прааналізавана гісторыя станаўлення і развіцця беларускага нацыянальнага мастацтва, выяўлена яго роля ў фарміраванні духоўных каштоўнасцей, эстэтычнага густу моладзі, яе далучэнні да свету прыгожага [5, с. 51]. У Скарынінскай бібліятэцы ў Лондане захоўваецца аўтограф Я.Коласа "Падумайце аб дзецях", у якім аналізуецца ўплыў кінематографа на дзяцей. Пісьменнік адзначаў, што дзеці пераймаюць тое, што бачаць у кіно, а многія сцэны нават пераходзяць у дзіцячыя гульні. Менавіта таму пісьменнік заклікаў кінарэжысёраў падчас стварэння кінафільмаў улічваць асаблівасці дзіцячага ўспрымання мастацкіх вобразаў.

У коласаўскай творчай спадчыне таксама адлюстравана дзейнасць Я.К.бібліятэк, клубаў, музеяў па ажыццяўленні духоўнай вытворчасці, трансляцыі культуры, фарміраванні высокіх духоўных патрэб, стварэнні ўмоў для выяўлення і рэалізацыі творчых здольнасцей асобы. Так, у "Прамове на XXI з'ездзе Камуністычнай партыі Беларусі", артыкулах "Культура і навука ў БССР за 30 год", "За паўтара дзесятка гадоў" Я.Колас адзначаў вялікую ролю музеяў, клубаў, дамоў культуры, хат-чытальняў, дамоў народнай творчасці і бібліятэк у асэнсаванні асобай гісторыі і культуры, развіцці яе інтэлектуальных, маральных і творчых магчымасцей, далучэнні да нацыянальнай і агульначалавечай культуры [5, с. 67–68].

Акрамя таго, у яго полі зроку знаходзіліся сродкі масавай інфармацыі, якія разглядаліся як від сацыякультурнага інстытута. Асэнсаванне мас-медыя ў цэлым і газет, часопісаў у прыватнасці маецца ў шэрагу прац пісьменніка. Рэфлексіяй аб сутнасці СМІ пранізаны артыкулы "Газеце "Савецкая Беларусь", "У рэдакцыю газеты "Літаратура і мастацтва", "Ліст у рэдакцыю" [7] і інш. Найбольш дэталёва Я.Коласам разгледжаны значэнне і месца друку ў працэсе фарміравання чалавека ў артыкулах "За паўтара дзесятка гадоў" і "Культура і навука ў БССР за 30 год", у якіх гаворыцца аб выключным значэнні друку ў жыцці беларускага грамадства: "…мушу адзначыць вялікае ідэйна-выхаваўчае значэнне іх, тое, што кожны чытач паводле свайго

ўзроўню і інтарэсаў заўсёды здолее адшукаць на старонках нашых часопісаў карыснае і цікавае для сябе” [5, с. 60].

Цэнтральнае месца ў працэсе інкультурацыі, на думку Я.Коласа, займае мова, якая ўплывае на фарміраванне светапогляду асобы, развіццё яе мыслення, эстэтычнага густу, крэатыўнасці. У артыкулах “З поваду майго юбілею”, “Литературная учеба”, “Мова М.Лынькова па раману “На чырвоных лядах” [7], “Шануйце і любіце сваю родную мову”, “Развіваць і ўзбагачаць літаратурную мову” і іншых публіцыстычных творах Я.Колас сцвярджаў, што мова выступае фактарам найлепшага развіцця асобы, што гэта важнейшая ўмова яе гарманічнага існавання. “Роднае слова, – адзначаў Я.Колас, звяртаючыся да беларускіх школьнікаў, – гэта першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё і акалюючы нас свет. Таму вам неабходна так старанна вывучаць сваю родную мову, ведаць і любіць лепшыя творы беларускай літаратуры” [5, с. 26].

Лейтматывам у коласаўскай творчай спадчыне праходзіць думка аб тым, што без роднай мовы адбываюцца дэградацыя асобы і грамадства, занядбанне іх інтэлектуальнага, творчага, маральнага патэнцыялу. Пісьменнік разглядаў мову не толькі ў якасці аднаго са школьных прадметаў, але і як важнейшы прадмет, які мае “агульнаасветнае”, “выхавальнае” і “практычнае значэнне” [5, с. 318]. Ён паказаў месца роднай мовы ў працэсах мыслення школьнікаў, разумення і ўяўлення імі з’яў культуры. Акрамя навукова-тэарэтычнага абгрунтавання ролі мовы ў інкультурацыі асобы, Я.Колас прадпрымае шэраг практычных крокаў па выяўленні ўмоў, спосабаў, метадаў і форм навучання беларускай мове. У 1925 г. ён завяршае працу па напісанні першага буйнога дыдактычнага твора “Методыка роднай мовы”, дзе паказвае, “як трэба весці навучанне роднай мове, каб яно было паспешным і навукова правільным” [5, с. 317]. Я.Колас выступаў супраць лінгвацэнтрычнай канцэпцыі, у адпаведнасці з якой галоўная ўвага звярталася на засваенне марфалагічных, сінтаксічных, фанетычных моўных адзінак. Гэтай канцэпцыі ён проціпастаўляе антрапацэнтрычную парадыгму, дзе ў цэнтр навучання ставяцца асоба суб’екта культуры, яго маўленчыя здольнасці ствараць і ўспрымаць выказванні. На думку класіка, “жывая мова”, слова “вымаўленае” даюць магчымасць назіраць за ўласна зараджэннем мыслі і яе развіццём [5, с. 478].

Асобны раздзел у “Методыцы роднай мовы” Я.Колас прысвячае ролі і месцу чытання і наогул кнігі ў інкультурацыі асобы.Чытанне, на яго думку, выступае “адзіным сродкам самаасветы, спосабам, якім вучні могуць “папаўняць свае веды незалежна ад дапамогі настаўніка”, “разбірацца ў тым матэрыяле, што дае кніга” [5, с. 396].

Я.Колас быў перакананы, што чытанне служыць і эстэтычнаму выхаванню дзяцей: "Яно ўзбагачае фантазію новымі вобразамі, даючы дзецям новыя разнастайныя перажыванні, выхоўвае ў іх густ да прыгожага, да паэзіі і мастацтва" [5, с. 396]. На падставе гэтага пісьменнік распрацаваў методыку чытання, у якой прапаноўваў беларускім педагогам шэраг дыдактычных спосабаў-прыёмаў, з дапамогай якіх магчыма выпрацаваць у школьнікаў навыкі і ўменні, неабходныя для чытання. Важна адзначыць, што псіхалогія чытання аналізавалася Я.Коласам у адпаведнасці з асноўнымі Я.Колас быў перакананы, што поспех навучання чытанню ў многім "залежыць не толькі ад спосабаў чытання, але і ад самога матэрыялу" [5, с. 402]. Творы для школьнага чытання, на яго думку, павінны быць напісаны спецыяльна. Праблему стварэння кніг для школьнікаў пісьменнік неаднаразова ўздымаў у сваіх публіцыстычных артыкулах. Так, у артыкуле "Быть гражданином" Я.Колас, аналізуючы школьную літаратуру, адзначаў, што ў адлюстраванні гісторыі беларускай культуры маецца шэраг недахопаў, адсутнічаюць добрыя падручнікі. Ён падкрэсліваў, што "хорошая хрестоматия, в которой умело подобраны наиболее характерные произведения, правильно отражающие развитие белорусской культуры и литературы, – фактор первостепенного значения в воспитании молодого поколения" [5, с. 28]. Гэтае пытанне пісьменнік ставіў і ў "Прамове на XXI з'ездзе Камуністычнай партыі Беларусі" [5]. Менавіта з улікам стымулявання эмацыянальнай і крэатыўнай дзейнасці вучняў пабудавана "Другое чытанне для дзяцей беларусаў" [6], якое было надрукавана ў 1910 Грунтоўна пісьменнікам раскрыты працэс перадачы культурнай інфармацыі шляхам вертыкальнай і гарызантальнай трансмісій. У першым выпадку, адзначаў Я.Колас, сацыякультурная інфармацыя перадаецца ад бацькоў і старэйшых сваякоў дзецям. Сутнасць вертыкальнай трансмісіі пісьменнік раскрыў у апавяданнях "Пад Новы год" [9], "На чыгунцы" [12]. Бацькі – літаратурныя героі тлумачаць дзецям, наколькі дазваляў ім розум, розныя з'явы навакольнага свету. Так, у апавяданні "Пад Новы год" бацька расказвае сваім сынам, што такое Новы год. У даступнай для дзяцей форме ён апавядае маленькім сынам, як адбываецца змена часу: "Адно кола змен часу мы перабылі, а з заўтрашняга дня зачнем другое. Вось гэты першы дзень, які зачынае сабою новае кола часу, і называецца Новым годам" [9, с. 43]. Другі літаратурны персанаж тлумачыць Івасю ("На чыгунцы"), для чаго замацоўваюцца рэйкі, што такое вайна і інш. [12, с. 201]. У апавяданні "Сірата Юрка" цётка Тэрэса знаёміла хлапчука з народнай медыцынай: "У лесе цётка гаварыла, для якой надобы належыць якая зёлка, ад якой хваробы ці запалення якога памагае тая

ці другая трава, і пазнаёміла Юрку з рознымі краскамі: пералётнікам, гарлянкай, румянкам, чаборам, мацердушкай… і з многімі другімі раслінамі” [12, с. 192]. У паэме “Новая зямля” апекуном дзяцей быў дзядзька Антось, які даваў адказы на пытанні, тлумачыў “ім усё да звання: / Адкуль, з чаго дзе што бярэцца, / Вось гэта, тое як завецца, / І чаму так, чаму не гэтак / Прыхілен дзядзька быў да дзетак, / Ён быў настаўнікам, суддзёю…” [10, с. 54]. З твораў Я.Коласа бачна, што ў сялянскай сям’і дзеці атрымлівалі не толькі практычныя навыкі да працы, але і засвойвалі розныя звычаі і абрады, у якіх непасрэдна ўдзельнічалі. У працы фарміраваўся і будучы пісьменнік, і спажывец гэтай культуры. Сістэма сямейнага выхавання дзяцей і моладзі, на думку Я.Коласа, павінна абапірацца на традыцыйную народную абраднасць, заснаваную на прынцыпах нормаў народнай этыкі і маралі. У паэме “Новая зямля” ўсебакова раскрыты працэс далучэння дзяцей да рэлігійна-святочных абрадаў і рытуалаў падчас святкавання Калядаў, Вялікадня, вобразна перададзены пачуцці беларусаў напярэдадні і ў час свята, а ўвага дзяцей усё больш канцэнтруецца не на вучобе, а на падрыхтоўцы да свята: “У хаце вучням не сядзіцца – / Прайшла ахвота ў іх вучыцца” , “А вучні кніжкі пахавалі / І ўсё вялікадня чаклі” [10, с. 230–231]. Святы заўсёды суправаджаліся цікавымі і маляўнічымі рытуальна-абрадавымі дзеяннямі, у якіх актыўны ўдзел прымалі не толькі дарослыя, але і дзеці.

Акрамя таго, Я.Коласам усебакова паказана таксама гарызантальная трансмісія, пры якой засваенне культурнага вопыту ажыццяўляецца ў стасунках з аднагодкамі. Так, у апавяданні “У старых дубах” два хлапчукі, якія былі шчырымі сябрамі, часта расказвалі адзін аднаму розныя гісторыі, здарэнні, спрабавалі дазнацца пра розныя прыродныя з’явы. У раздзеле “Каля зямлянкі” з паэмы “Новая зямля” падаецца інфармацыйна-камунікатыўнае ўспрыманне з’яў прыроды Алесем і Кастусём [10, с. 72–79]. На наш погляд, гарызантальная трансмісія найбольш поўна раскрыта ў аповесці “На прасторах жыцця” праз узаемаадносіны галоўных герояў – Сцёпкі Баруты і Алены Гарнашкі. Набытыя на рабфаку веды і навыкі Сцёпка перадае Алене, дзякуючы чаму дзяўчына таксама вырашае атрымаць педагагічную адукацыю, каб быць карыснай для грамадства.

Такім чынам, інтэнцыянальны змест працэсу інкультурацыі у творах Я.Коласа сведчыць, што пісьменнік ясна разумеў сэнс, характар інкультурацыіі і яе значэнне для грамадства. Ён быў перакананы, што інкультурацыя садзейнічае абнаўленню і напаўненню нацыянальнай культуры беларусаў новым сэнсам і зместам, якія арыентуюць

асобу на маральнае самаўдасканаленне, актывізацыю культуратворчасці, што набывае значную актуальнасць для сучаснага грамадства.

1. Herskowitz, M.J. Men and his work: the science of cultural anthropology / M.J. Herskowitz. – New York : A.A. Knopf, 1948. – 673 p.

2. Mead, M. Socialization and enculturation / M. Mead // Current Anthropology. – 1963. – Vol. 4, iss. 2. – P. 184–188.

3. Mead, M. Socialization and enculturation / M. Mead // Current Anthropology. – 1963. – Vol. 4, iss. 2. – P. 184–188.

4. Мацумото, Д. Психология и культура : перевод / Д. Мацумото. – СПб. : Питер, 2003. – 718 с.

5. Колас, Я. Збор твораў : у 14 т. / Я. Колас ; Акад. Навук БССР, Ін-т літ. ; рэдкал.: В. Барысенка [і інш.]. – Мінск : Маст. Літ., 1972–1978. – Т. 12 : Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы 1947–1956 гг. / рэд.: П. Броўка, Ю. Пшыркоў ; падрыхт. Тэкста і камент. У. Ларчанкі. – 1976. – 527 с.

6. Колас, Я. Другое чытанне для дзяцей беларусаў / Я. Колас ; перагл.

7. Сеўрук Л. – Пецярбург : [Загляне сонца і ў наша ваконца : Наша хата], 1909. – 110 с.

8. Колас, Я. Другое чытанне для дзяцей беларусаў / Я. Колас ; перагл. Л. Сеўрук. – Пецярбург : [Загляне сонца і ў наша ваконца : Наша хата], 1909. – 110 с.

9. Колас, Я. Збор твораў : у 14 т. / Я. Колас ; Акад. Навук БССР, Ін-т літ. ; рэдкал.: В. Барысенка [і інш.]. – Мінск : Маст. Літ., 1972–1978. – Т. 9 : Трылогія «На ростанях» / рэд. Ю. Пшыркоў ; падрыхт. Тэкстаў і камент. С. Забродскай. – 1975. – 790 с.

10. Колас, Я. Збор твораў : у 14 т. / Я. Колас ; Акад. навук БССР, Ін-т літ. ; рэдкал.: В. Барысенка [і інш.]. – Мінск : Маст. літ., 1972–1978. – Т. 5 : паслякастрычніцкага перыяду і «Казкі жыцця » / рэд.: М. Лынькоў, Ю. Пшыркоў ; падрыхт. тэкстаў і камент. І. Крэнь, К. Піліповіч. – 1973. – 630 с.

11. Колас, Я. Збор твораў : у 14 т. / Я. Колас ; Акад. Навук БССР, Ін-т літ. ; рэдкал.: В. Барысенка [і інш.]. – Мінск : Маст. Літ., 1972–1978. – Т. 6 : Новая Зямля ; Сымон-музыка : паэмы / рэд. М. Мушынскі ; падрыхт. Тэкстаў і камент. В. Дэконскай, У. Ларчанкі. – 1974. – 614 с.

12. Колас, Я. Збор твораў : у 14 т. / Я. Колас ; Акад. Навук БССР, Ін-т літ. ; рэдкал.: В. Барысенка [і інш.]. – Мінск : Маст. Літ., 1972–1978. – Т. 13 : Пісьмы, 1908–1956 гг. / рэд. Ю. Пшыркоў ; падрыхт. Тэкстаў і камент. А. Атаевай [і інш.]. – 1977. – 678 с.

13. Колас, Я. Збор твораў : у 14 т. / Я. Колас ; Акад. навук БССР, Ін-т літ. ; рэдкал.: В. Барысенка [і інш.]. – Мінск : Маст. літ., 1972–1978. – Т. 4 : Апавяданні, 1906–1917 гг. / рэд. В. Барысенка ; падрыхт. тэкстаў і камент. У. Ларчанкі. – 1973. – 341 с.

## INCULTURATION OF THE PERSONALITY OF A BELARUSIAN AS A SUBJECT OF CULTURAL INTENTIONS OF YAKUB KOLAS' CREATIVITY

***Olga Verbitskaya***
*Belarusian State University of Culture and Arts, Minsk, Belarus,*
*olia-verba@mail.ru*

The Belarusian cultural studies creative heritage of Yakub Kolas is regarded as hypertext of national culture of Belarusians, the idea similar to the theory of inculturation is found, the dominant component of the culture of the upper classes and the peasantry is identified

***Keywords: inculturation, intentions, cultural transmission, values.***